ня для нас уяўляюць несумненную цікавасць іх канструктыўныя ідэі. Да іх ліку адносяцца: замена прыватнай уласнасці грамадскай, усеагульная праца, справядлівае размеркаванне ў залежнасці ад працоўнага ўкладу, пераадоленне антаганізму паміж горадам і вёскай, злучэнне разумовай і фізічнай працы, навукі і прамысловасці, абумоўленасць выхавання сацыяльным асяроддзем, фарміраванне ўсебаковай і гарманічна развітой асобы. Асаблівую цікавасць уяўляюць для нас думкі сацыялістаў-утапістаў аб палітыцы і дзяржаве. Так, А.Сен-Сімон разглядаў палітыку як імкненне часткі грамадства трымаць у паслухмянасці другую. Вось чаму, даказваў ён, калі будзе ліквідавана эксплуатацыя чалавека чалавекам, людзі вызваляць вялікую энергію для барацьбы з прыродай, прамысловага развіцця, прагрэсу, навукі. Палітыка звядзецца да простай адміністрацыйнай дзейнасці, а дзяржава са сродка кіравання людзьмі стане сродкам "кіравання рэчамі", г.зн. звядзецца да кіраўніцтва працэсамі вытворчасці. Як бачым, ужо ў працах Сен-Сімона сустракаецца думка аб паступовым адміранні дзяржавы, якая магутна прагучала пазней у класічным марксізме.

Нават гэты кароткі агляд дазваляе зразумець, што на працягу стагоддзяў лепшыя розумы чалавецтва спрабавалі вырашыць пытанні дзяржавы, права, улады, палітыкі, свабоды, справядлівасці. Адбывалася сістэматычнае набыццё тэарэтычных ведаў у гэтай галіне. Гэтыя вечныя праблемы кожны раз узнікалі зноў у новых гістарычных абставінах. Пры гэтым іх рашэнне заўсёды ўбірала ў сябе мудрасць мінулых стагоддзяў. Так паступова ствaралася сучасная палітычная навука, да вывучэння якой мы і прыступаем.

## ПАЛІТЫЧНАЯ СІСТЭМА ГРАМАДСТВА: ПАНЯЦЦЕ І ТЫПЫ

Адной з цэнтральных праблем курса паліталогіі з'яўляецца праблема палітычнай сістэмы грамадства. У аснове палітычнай сістэмы грамадства любой краіны ляжаць палітычныя адносіны, палітыка. Узнікненне такіх адносін непарыўна звязана з класавым дзяленнем грамадства, а гістарычна першым інстытутам палітычнай сістэмы была дзяржава, якая ўтварылася ў сувязі з расколам грамадства на антаганістычныя класы.

Са сказанага вынікае, што палітычная сістэма грамадства - гэта не злучэнне класау, нацый, іншых сацыяльных груп і асоб, як гэта калі-нікалі сцвярджаюць /Белых А.К. Палітычная арганізацыя грамадства і сацыяльнае кіраванне. - Л., 1967. - С. 15-16/. Яе кампанентамі выступаюць не сацыяльныя групы і асобы, а перш за ўсё вызначаныя інстытуты /арганізацыі, аб'яднанні, установы/, якія прадстауляюць інтарэсы тых або іншых класау /слаёў/, што з'яўляюцца першаснымі удзельнікамі палітыкі, палітычных адносін. Палітычная сістэма грамадства - гэта сістэма дзяржаўных і недзяржауных сацыяльных інстытутау, якія ажыццяўляюць пэўныя палітычныя функцыі.

Пры вывучэнні гэтай праблемы мэтазгодна акцэнтаваць увагу на наступных важных пытаннях:

1. Сутнасць і структура палітычнай сістэмы грамадства.

2. Функцыі палітычнай сістэмы.

3. Тыпы сучасных палітычных сістэм.

Паняцце палітычнай сістэмы дазваляе нам акрэсліць межы палітычнага жыцця, яго кампаненты, сувязі паміж імі, яго функцыі. Па сваім аб'ёме катэгорыя "палітычная сістэма грамадства" блізкая да катэгорыі "палітычнае жыццё грамадства", аднак калі паняцце "палітычнае жыццё" характарызуе сам палітычны працэс у яго дынаміцы, актыўнасці, то палітычная сістэма раскрывае кампаненты палітычнага працэсу, яго якасны бок, г.зн. палітычнае ў іх разглядаецца пад рознымі пунктамі погляду.

Палітычная арганізацыя грамадства - гэта сістэма дзяржаўных і грамадскіх арганізацый пануючага класа /класаў/, якая ажыццяуляе кіраўніцтва, управуляе развіццём сацыяльнага жыцця ў інтарэсах гэтага класа (або класаў). /Куфтыраў В.І., Лузан А.А. Аб змесце і сутнасці палітычнай арганізацыі, грамадства. - Філасофскія навукі, 1976. - № 3. - С. 150-153/. Такім чынам, паняцце "палітычная сістэма грамадства", па сваім аб'ёме, больш шырокае, чым "палітычная арганізацыя грамадства".

Можна выдзеліць чатыры групы асноўных элементаў палітычнай сістэмы любога грамадства: 1/ палітычная структура /або палітычная арганізацыя/; 2/ палітычныя і прававыя нормы; 3/ палітычныя адносіны; 4/ палітычная свядомасць і палітычная культура. Чатыры групы элементаў палітычнай сістэмы характарызуюць розныя бакі яе жыццядзейнасці. Так, палітычная структура

грамадства уключае ў сябе перш за ўсё стварэнне дзяржаўных і іншых палітычных арганізацый, формы і механізм удзелу грамадзян у палітычным жыцці і г.д. Палітычныя і многія прававыя нормы вызначаюць у фармалізаваным выглядзе характар палітычных адносін у грамадстве. Палітычныя адносіны адлюстроўваюць рэальныя паводзіны ўсіх сацыяльных груп і індывідаў у палітычным працэсе. Палітычная свядомасць і палітычная культура таксама ёсць атрыбуты ўсіх удзельнікаў палітычных адносін, кіруючых і кіруемых.

Галоўным сувязным звяном палітычнай сістэмы з'яўляецца палітычная ўлада, якая прыдае палітычнай сістэме цэласнасць, выдзяляе яе з грамадства ў якасці адносна самастойнай падсістэмы. Палітычная ўлада выступае сутнаснай характарыстыкай эканамічна пануючага класа, выражэннем яго волі і пануючага становішча ў грамадстве. Але яна з'яўляецца вярхоўнай уладай грамадства і тым вызначае тып усёй палітычнай сістэмы, з'яўляецца яе важнейшым кампанентам, цэнтральным звяном, якое вызначае сістэмную аснову, вакол якой і па прычыне якой функцыяніруюць усе астатнія кампаненты палітычнай сістэмы.

Стрыжнёвым /асноўным/ кампанентам палітычнай сістэмы грамадства з'яўляецца дзяржава. Яна выступае асноўным носьбітам палітычнай улады, асноўным сродкам рэалізацыі класавых інтарэсаў і ў сувязі з гэтым - галоўным суб'ектам і адначасова галоўным аб'ектам палітычнай дзейнасці і палітычных адносін. У палітычнай сферы носьбітамі, матэрыяльнымі субстратамі палітычнай дзейнасці і палітычных адносін выступаюць арганізацыі, перш за ўсё палітычныя партыі. Праз іх сацыяльна-гістарычныя супольнасці ажыццяўляюць сваю функцыю суб'екта палітычнай дзейнасці, у іх матэрыялізуюцца палітычныя адносіны, яны выступаюць як згусткі, устойлівыя вузлы.

Важным кампанентам палітычнай сістэмы буржуазнага грамадства з'яўляюцца прадпрымальніцкія арганізацыі. /Лузан А.А. Палітычнае жыццё грамадства: пытанні тэорыі. - Кіеў: 1989. - С. 61/. У дакапіталістычных грамадствах пануючыя класы былі арганізаваны ў дзяржаве і слабыя ў арганізацыйных адносінах партыі. Іншых аб'яднанняў яны, як правіла, не мелі. Тэрытарыяльныя дваранскія таварыствы ў Расіі ігралі нязначную ролю ў палітычным жыцці краіны, хаця іх ігнараваць поўнасцю нельга,

аналізуючы палітычнае жыццё. Ва ўмовах капіталізму ў сувязі з абвастрэннем класавай барацьбы і ўзмацненнем адноснай самастойнасці дзяржавы пануючы клас ужо не можа абысціся для абароны сваіх інтарэсаў дзяржавай і ўласнымі палітычнымі партыямі. Узнікнуўшы спачатку як эканамічныя арганізацыі, прызваныя адлюстроўваць і абараняць эканамічныя інтарэсы класа буржуазіі, прадпрымальніцкія арганізацыі ў цяперашні час іграюць важную ролю ў ператварэнні эканамічнай магутнасці манапалістычнага капіталу ў палітычную магутнасць. У іх дзейнасці, у іх сувязях з дзяржавай найбольш выразна праяўляецца працэс зрошчвання сілы манаполій з сілай дзяржавы.

Палітычная сістэма грамадства, у якім ёсць антаганістычныя класы, у якасці неад'емнага кампанента ўключае ў сябе царкву. /Ленін У.І. Аб значэнні ваяўнічага матэрыялізму. - Поўны збор тв. - Т. 45. - С. 27/. Царква ў класава-антаганістычным грамадстве з'яўляецца арганізацыяй палітычнай. Ні адно класава-антаганістычнае грамадства не магло абысціся без царквы як рэгулятара грамадскіх адносін, як актыўнай палітычнай сілы /і не толькі духоўнай/ у справе захавання існуючага ладу. Неабходна толькі падкрэсліць, што ў якасці субстратнага кампанента палітычнай сістэмы выступае не рэлігія, а царква. /Яблакаў І.М. Сацыялогія рэлігіі. М., 1979. - С. 115-122/.

Важнейшым кампанентам палітычнай сістэмы выступае палітычнае мысленне. Ужо разглядалася, што палітычная дзейнасць - гэта ўсвядомленая дзейнасць па пераўтварэнні грамадскіх адносін. "Змест палітычнага мыслення праяўляецца ў форме палітычнай дзейнасці, яно арганічна ўплецена ў палітычную структуру і ўяўляе сабой рэальнае звяно яе функцыяніравання". /Мшвеніерадзе В.В. Сучаснае буржуазнае палітычнае мысленне. М.: 1981. - С. 125/. "Палітыка ўключае ў сябе палітычнае мысленне /вышэйшае выражэнне якога - палітычная партыя/ і палітычную дзейнасць", - канстатуе М.Н.Руткевіч. /Руткевіч М.Н. Праблемы існасці ў сферы палітычнага мыслення. У кн.: Новы сусветны парадак і палітычная супольнасць. М.: 1983. - С. 128/. І хаця гэта думка, на наш погляд, некалькі катэгарычная ў тым сэнсе, што наўрад ці правамерна зводзіць палітыку толькі да мыслення і дзейнасці, у ёй даклапна падкрэсліваецца непарыўная сувязь палітычнага мыслення і палітычнай дзейнасці.

Неад'емным кампанентам любой палітычнай сістэмы з'яўляюцца палітычныя і прававыя нормы. З'яўляючыся ўзорамі палітычнай дзейнасці, выпрацаванымі ў працэсе грамадска-гістарычнай практыкі, яны стабілізуюць палітычную дзейнасць, забяспечваюць яе ўстойлівасць і накіраванасць. Асабліва вялікая роля прававых норм у рэгламентацыі палітычнай дзейнасці. Прававыя нормы, з'яўляючыся па сваёй сутнасці палітычнымі, далёка не вычэрпваюць усіх палітычных норм.

Такім чынам, палітычная сістэма грамадства ўключае ў сябе палітычныя арганізацыі, якія складаюць грамадства класаў і адносіны паміж імі, нормы і прынцыпы палітычнай дзейнасці і палітычнага мыслення.

Што адрознівае палітычную сістэму ад іншых сістэм грамадства? Першае - вяршэнства палітычнай сістэмы: гэта значыць, што з яе дапамогай ажыццяўляецца палітычная ўлада ў грамадстве, што прымаемыя ў яе рамках рашэнні абавязковыя для ўсяго грамадства і кожнай яго падсістэмы. Другое - абумоўленасць палітычнай сістэмы грамадскім асяроддзем, у першую чаргу сацыяльна-эканамічнай структурай. Як сродак ажыццяўлення палітычнай улады, палітычная сістэма тым не менш уяўляе сабой надбудову, дэтэрмінаваную эканамічным і сацыяльным базісам грамадства. Трэцяе - адносная самастойнасць палітычнай сістэмы вызначаецца наяўнасцю спецыяльнага механізма структур, роляў, функцый, груп. Палітычная сістэма ў значнай ступені фармалізавана, бо адносіны ў яе рамках, як правіла, рэгулююцца спецыяльнымі нормамі - прававымі і палітычнымі.

Любая грамадская сістэма, у тым ліку і палітычная, як падсістэма больш агульнай сістэмы, якім выступае грамадства, з'яўляецца гэтакай не толькі ў сілу сістэмнай якасці, але ў сілу наяўнасці азначанай функцыі, якую яна выконвае адносна іншых грамадскіх падсістэм і грамадства ў цэлым. Пагэтаму аналіз кампанентнага складу і структуры палітычнай сістэмы неабходна дапоўніць аналізам яе функцыянальнага прызначэння.

Паняцце функцыі найбольш дэталёва распрацавана у юрыдычнай навуцы прымяняльна да дзяржавы, дзе пад функцыямі апошняй разумеюцца "асноўныя напрамкі /і бакі/ у яе дзейнасці па рашэнні гістарычных задач, якія стаяць перад дзяржавай на галоўных этапах яе развіцця" /Чарнагалоукін Н.В. Тэорыя функцый

сацыялістычнай дзяржавы. М.: 1970. - С. 7/.

Прымаючы маштабнасць і разнастайнасць праяўлення дзеяння палітычных сістэм, можна вылучыць наступныя іх функцыі: а/ палітычнае мэтамеркаванне, б/ уладна-палітычная інтэграцыя грамадства, в/ рэгуляванне рэжыму сацыяльна-палітычнай дзейнасці, г/ забеспячэнне цэласнага кіраўніцкага ўздзеяння на грамадскія працэсы.

Функцыя палітычнага мэтамеркавання мае першараднае значэнне для існавання і развіцця любой палітычнай сістэмы. Сацыяльныя супольнасці: народ, класы, нацыі, слаі, групы, калектывы, апасродкуючы свае інтарэсы ў дзейнасці інстытутаў палітычнай сістэмы, імкнуцца пазнаць аб'ектыўную рэальнасць і выпрацаваць шляхі руху. Усё гэта мае складаны характар не толькі сацыяльнага пазнання з уласцівымі яму метадамі вывучэння і выкарыстання аб'ектыўных заканамернасцей, прагназіравання, выяўлення супярэчнасцей і праблем, якія патрабуюць рашэння, вызначэння мэт і шляхоў іх дасягнення, але і сацыяльнага дзеяння, барацьбы інтарэсаў, пошукаў шляхоў іх узгаднення, знаходжанне форм выражэння інтарэсаў і наданне ім агульнага значэння.

Мэта выступае як прадбачаны будучы стан, да якога свядома імкнуцца людзі і іх арганізацыі. Палітычнае мэтамеркаванне абазначае перш за ўсё выпрацоўку ўласных палітычных мэт, якія закранаюць зменнасць улады, палітычных інстытутаў, развіццё дэмакратыі, класавых, нацыянальных адносін і г.д. Яно ўключае і ўстанаўленне мэт развіцця іншых сфер грамадскага жыцця - эканамічнай, сацыяльнай і г.д. Замацаванне мэт у палітычных дакументах партый, у канстытуцыях і законах абазначае наданне ім усеагульнага характару. Адначасова адбываецца ранжыраванне мэт з улікам іх прыроды і рэальных магчымасцей ажыццяўлення /тактычныя, стратэгічныя мэты, вызначэнне прыярытэтаў у дасягненні мэт/.

Выбар і ўстанаўленне мэт патрабуюць сур'ёзнай палітычнай дзейнасці, якая абапіраецца на навуковы аналіз працэсаў, што адбываюцца ў палітычным жыцці, на ўсебаковыя разлікі, прагнозы, ацэнкі магчымых альтэрнатыў палітычнага курсу. На Захадзе атрымала развіццё "навука аб будучым" - футуралогія, якая занята прадказаннем перспектыў, распрацоўкай "сцэнарыяў" унутранага і міжнароднага развіцця. Марксісцкая прагностыка абапіра-

ецца на навукова пазнаныя заканамернасці, на усебаковы аналіз эканамічных, сацыяльных, палітычных працэсаў. /Гл. Бястужаў-Лада І.В. Пошукавае сацыяльнае прагназіраванне. Перспектыўныя праблемы грамадства. М.: 1984/. Функцыя ўладна-палітычнай інтэграцыі грамадства абазначае выкарыстанне палітыкі і ўлады для выяўлення волі пануючых класау, усяго народа і падпарадкавання ёй усіх асноўных дзеянняў у грамадстве. Гаворка ідзе, па-першае, аб агульнаабавязковасці дзяржауных загадау, якія абапіраюцца на прымусовую сілу, па-другое, аб выкарыстанні права, закона для агульназначнага рэгулявання грамадскіх адносін; па-трэцяе, аб наданні палітыцы грамадскага аутарытэту, аб ступені развіцця ці дэмакратыі і самакіравання, ці аўтарытарнага палітычнага рэжыму і палітычнага адчужэння, па-чацвёртае, аб вядомай субардынацыі і каардынацыі інстытутаў палітычнай сістэмы і іх звенняў.

Вялікае значэнне мае функцыя рэгулявання рэжыму сацыяльна палітычнай дзейнасці ў грамадстве. Маецца на ўвазе ўстанаўленне такіх спосабаў паводзін і дзейнасці людзей, груп, арганізацый, форм іх узаемаадносін паміж сабою і дзяржавай, якія б забяспечвалі выкананне агульных інтарэсаў і ўстойлівасці грамадскіх адносін. Сацыяльна-палітычныя нормы ўкараняюць ідэалы і каштоўнасці, стымулы і матывы грамадскіх паводзін, прызваныя дапамагчы пераадолець канфлікты і ўстанаўленне выгаднага пануючым класам вырашэння палітычных, эканамічных і іншых пытанняў, якія ўзнікаюць у ходзе грамадскага развіцця. Адсюль дынамічнасць палітычнага рэжыму нават у рамках адных і тых жа інстытутаў пры змяненні суадносін класавых сіл.

Функцыя забеспячэння цэласнага кіраўніцкага ўздзеяння на грамадскія працэсы выражае патэнцыял палітычнай сістэмы як суб'екта кіравання верхняга ўзроўню. Аб'ектамі кіравання з'яўляюцца грамадства і яго сферы, галіны эканомікі і культуры, рэгіёны, асобныя вытворчыя адзінкі, сацыяльныя супольнасці, а таксама працэсы развіцця, якія ім уласцівы. У ходзе кіравання выкарыстоўваюцца рэсурсы грамадска-прыродныя, матэрыяльныя, людскія, рэгулюецца ў пэўных сацыяльных інтарэсах развіцце вытворчасці, навукі, культуры і г.д., размеркаванне даходаў. Для гэтага ажыццяўляюцца асноўныя функцыі кіраўніцкага цыкла: апрацоўваецца і выкарыстоўваецца інфармацыя, прымаюцца і рэа-

лізуюцца рашэнні, ажыццяўляецца кантроль.

Функцыі палітычнай сістэмы не з'яўляюцца нязменнымі, яны развіваюцца з улікам канкрэтна-гістарычных абставін, дасягнутага ўзроўню эканомікі, культуры, дабрабыту, палітычнай стабільнасці. З'яўляюцца новыя падфункцыі і відазмяняюцца раней існуючыя. Мяняюцца суадносіны паміж імі. Гістарычны вопыт сведчыць і аб праяўленні "дысбалансу" функцый і няпоўным выкананні некаторых з іх у перыяды ўнутраных крызісаў і войнаў. Сярод савецкіх філосафаў і сацыёлагаў няма адзінства ў разуменні паняцця "функцыя сістэмы". Найбольш шырокае распаўсюджанне атрымаў погляд Ф.М.Бурлацкага, які лічыў, што асноўнымі функцыямі палітычнай сістэмы з'яўляюцца:

1/ вызначэнне мэт і задач грамадства;

2/ мабілізацыя рэсурсаў для дасягнення мэт, якія ставяць перад грамадствам яго кіруючыя сацыяльна-класавыя сілы;

3/ інтэграцыя ўсіх элементаў грамадства;

4/ легітымізацыя, пад якой разумеецца дасягненне мінімальна неабходнай ступені адпаведнасці рэальнага палітычнага жыцця афіцыйным палітычным і прававым нормам /Бурлацкі Ф.М., Галкін А.А. Сучасны Левіафан: Нарысы палітычнай сацыялогіі капіталізму. М.: 1985. - С. 31-32/.

(III) Палітычная структура грамадства выражае ўстойлівасць палітычных адносін, характарызуе іх тып. Сама ідэя тыпалогіі палітычных сістэм узнікла ў адказ на патрэбнасць у нарматыўных катэгорыях і методыцы параўнальнага аналізу розных палітычных сістэм, суаднясенне структурных і функцыянальных элементаў сістэм, якія параўноўваюцца, і г.д.

На думку нямецкага сацыёлага, філосафа і гісторыка Макса Вебера /1864-1920/, антычнасць, феадалізм, капіталізм не аб'ектыўна існуючыя адносіны, а спосабы ідэальнай тыпізацыі. Найвялікшы ўклад у тэорыю тыпалогіі палітычных сістэм унеслі самыя вядомыя прадстаўнікі структурна-функцыянальнага напрамку сучаснай буржуазнай паліталогіі - Г.Элманд, С.Верба, Т.Парсонс, Г.Каплан і інш.

Калі ў 50-я-пачатку 60-х гадоў на пытанні аб тыпалагізацыі палітычных сістэм панаваў погляд Г.Элманда, які лічыў асноватворным прынцыпам тыпалогіі сістэм спалучэнне шэрагу культуралагічных і паводзінскіх ролевых момантаў, уласцівых як

сістэме, так і суб'ектам яе, дык у наступныя гады гэты прынцып падверглі абгрунтаванай крытыцы. За тыпалагічныя прыкметы сістэм сталі брацца адна ці некалькі адметных асаблівасцей той ці іншай палітычнай сістэмы. Часта у аснову тыпалогіі клаўся прынцып "устойлівасці", распрацаваны Т.Парсонсам. Парсонс лічыў, што найбольш агульнай і фундаментальнай характарыстыкай палітычнай сістэмы з'яуляецца ўзаемасувязь паміж яе элементамі. Парадак у іх узаемных адносінах указвае на тэндэнцыю сістэмы да самазахоўвання, выражаную ў панянцці раўнавагі. Адметнай рысай такога тыпу сістэм можа быць тэндэнцыя да супраціўлення зменам, імкненне сістэмы па магчымасці захаваць першапачатковую структуру, якая трымаецца на згодзе яе членаў адносна асноўных каштоўнасцей - у гэтым ён блізкі канцэпцыі Г.Эл манд а.

Тыпалогія палітычных сістэм грамадства як у мінулым, так і цяпер вызначаецца грамадска-эканамічнай фармацыяй. Тып палітычнай сістэмы, яе змест, характэрныя рысы і асаблівасці вызначаюцца перш за ўсё на аснове таго, якому пануючаму класу належыць дадзеная палітычная сістэма. А гэта значыць, што тыпы палітычных сістэм вызначаюцца сацыяльна-эканамічным базісам дадзенага грамадства. Кожная сацыяльна-эканамічная фармацыя мае толькі ёй уласцівы базіс і тып палітычнай надбудовы, працэс гэты дыялектычны. Зноў узнікшая палітычная сістэма хутка ўдасканальваецца, набірае сілы, абнаўляецца, прыстасоўваецца да свайго базісу, з'яўляюцца новыя палітычныя інстытуты ўлады і кіравання. Сыходзяць з палітычнай арэны аджытыя ўласцівасці пануючага класа і іх сістэма кіравання, а на іх месцы з'яўляюцца новыя палітычныя сілы. Яны ствараюць па сваім вобразе і падабенстве палітычную надбудову. Іх сацыяльны заказ, волю ў палітычнай сістэме выконваюць адпаведныя ім партыі, іншыя палітычныя інстытуты. /Палітология. Вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў усіх форм навучання. Мінск: 1990. - С. 20/.

Сучасныя палітычныя сістэмы можна раздзяліць на 3 тыпы:
- буржуазнага грамадства,
- сацыялістычнага грамадства,
- краін трэцяга свету.

Савецкія вучоныя удзяляюць значную ўвагу пытанням сутнас-

цы і зместу палітычнай сістэмы буржуазнага грамадства. Прасочваюцца два падыходы да рашэння гэтых пытанняў. Пры першым сацыяльную сутнасць і змест палітычнай сістэмы грамадства непасрэдна звязваюць з прыродай і асаблівасцямі дзяржаўнай або палітычнай улады; "сацыяльная сутнасць палітычнай сістэмы грамадства прадвызначаецца класавай прыродай улады; сутнасць палітыка-юрыдычнай надбудовы грамадства вызначаецца тым, інтарэсы якога класа яна прадстаўляе, які клас трымае ў сваіх руках апарат палітычнай улады" і г.д. / Келе В.Ж., Кавальзон М.Я. Тэорыя і гісторыя /праблемы тэорыі гістарычнага працэсу/. М.: 1981. - С. 144/. Асаблівасць другога падыходу зводзіцца да таго, што класавая сутнасць і змест палітычнай сістэмы буржуазнага грамадства вызначаюцца праз суадносіны процілеглых класавых сіл.

У працэсе разгляду састаўных элементаў і структуры палітычнай сістэмы буржуазнага грамадства трэба мець на ўвазе непарыўную сувязь і ўзаемадзеянне элементаў і структуры. Неабходна таксама ўлічваць узаемаабумоўленасць элементаў і структуры палітычнай сістэмы буржуазнага грамадства не толькі адзін адным, але і адпаведнымі якаснымі характарыстыкамі самой сістэмы - яе палітычнасцю, арганізаванасцю, матэрыяльнасцю, унутранай супярэчлівасцю, шырынёю ахопу палітычнага жыцця, палітычных інстытутаў і працэсаў, глабальнасцю і інш.

І нарэшце, тэарэтычна і метадычна важна зыходзіць з таго, што палітычная сістэма буржуазнага грамадства выступае як асобая па сваім характары і ўнутранай будове складаная сістэма, дакладней сістэмны комплекс, полісістэма, якая складаецца з такіх супярэчнасцей састаўных частак, як сістэма /падсістэма/ арганізацый буржуазіі, сістэма /падсістэма/ так званых прамежкавых звенняў і сістэма /падсістэма/ аб'яднанняў пралетарыяту. Натуральна, што для поўнага і ўсебаковага вывучэння такога сістэмнага комплексу, або полісістэмы,якая ўключае структуру і элементы арганізацыі буржуазнага грамадства, неабходны шматпланавы, дыферэнцыраваны падыход.

Палітычная сістэма сучаснага капіталізму - гэта класавае ўтварэнне, якое забяспечвае існаванне грамадства як адзінага арганізма, мэтанакіравана кіруемага палітычнай уладай. Адсюль вынікае, што першачарговай задачай аналізу гэтай сістэмы

з'яўляецца вычляненне складаючых яе падсістэм і элементаў, вывучэнне іх функцыяніравання, развіцця і ўзаемадзеяння. Уяўляецца мэтазгодным выдзеліць чатыры падсістэмы у залежнасці ад іх ролі і выконваемай функцыі: А - палітычныя арганізацыі, В - палітычныя нормы, С - палітычныя адносіны, Д - палітычная свядомасць.

Найбольш тыповым выражэннем палітычнай сістэмы сучаснага капіталізму можна лічыць яе формы, якія склаліся ў краінах Заходняй Еўропы і ЗША. У апошняй трэці XX ст. яе асноунай рысай становіцца нарастаючая нестабільнасць пры адноснай стабільнасці палітычнай сістэмы некаторых краін. Некаторыя даследчыкі, напрыклад Г.Экстайн, падзялілі заходнія дэмакратыі на тры тыпы. Да першага ён адносіў палітычныя сістэмы, заснаваныя на кансенсусе /напрыклад, Вялікабрытанія/; да другога - сістэмы, інтэграваныя механічна, унутранае счапленне інстытутаў і суб'ектаў якіх забяспечваецца выключна прынцыпам раздзялення палітычнай адказнасці. Узорам такога тыпу сістэм Г.Экстайн лічыў ЗША. Трэці тып - абшчынныя сістэмы, заснаваныя на адносінах салідарнасці паміж адасобленымі групамі ўнутры сістэм /Палітычныя інстытуты ЗША. Гісторыя і сучаснасць. М.: 1988. - С. II/.

Пры ўсёй агульнасці класавых рыс сучаснага палітычнага ладу ў асноўных капіталістычных краінах, для якога характэрна буржуазна-дэмакратычная форма панавання манапалістычнага капіталу пры адносна высокай развітасці "цывільнага грамадства", іх палітычныя інстытуты, палітычныя сістэмы не аднатыпныя.

Для разумення сутнасці палітычнай сістэмы сацыялістычнага грамадства важнымі з'яўляюцца адказы на пытанні: а/ у чыіх інтарэсах ажыццяуляецца палітычная ўлада; б/ хто і як дадзеную ўладу ажыццяўляе? Яе асноўная функцыя заключаецца ў забеспячэнні ўлады працоўнага народа і яна ўяўляе сабой той механізм, пры дапамозе якога выпрацоўваюцца мэты і задачы грамадскага развіцця і вызначаюцца сродкі дасягнення мэт і выканання задач.

Палітычная сістэма сацыялістычнага грамадства - гэта сукупнасць дзяржаўных і іншых арганізацый, з дапамогай якіх працоўныя ажыццяўляюць сваю уладу, вядуць будаўніцтва новага жыцця. Яе састаўнымі элементамі з'яўляюцца рознага роду палітыч-

ныя інстытуты, пачынаючы з дзяржавы і яе арганізацый рознага віду і канчаючы так званымі нефармальнымі суполкамі, якія актыўна праяўляюць сябе ў апошні час. Акрамя таго, палітычная сістэма сацыялістычнага грамадства мае сваю нарматыўную базу, у якую ўваходзяць розныя віды сацыяльных норм, і перш за ўсё палітычных, якія могуць мець як прававую, так і неправавую форму. У палітычную сістэму ўваходзяць і працоўныя калектывы, якія выконваюць важныя палітычныя функцыі. Але на працягу доўгага часу палітычная сістэма сацыялістычных краін падвяргалася дэфармацыі. У выніку там склаліся аўтарытарна-бюракратычныя сістэмы кіравання грамадствам.

Буйныя палітычныя перамены ў краінах Усходняй Еўропы з'яўляюцца вынікам мірных дэмакратычных рэвалюцый, якія адбыліся там, перайначылі шлях развіцця гэтых краін. Для іх зараз характэрны няпросты пераход ад аўтарытарных аднапартыйных рэжымаў, што выступалі пад сцягам сацыялізму /які фактычна не быў пабудаваны/, да плюралістычнай дэмакратыі, цывільнага грамадства, рыначнай эканомікі.

Выбары ў парламент, якія адбыліся ў першай палове 1990 года ў краінах гэтага рэгіёна, замацавалі кардынальна новую расстаноўку палітычных сіл, прыдалі легітымнасць новым рэжымам, якія прыйшлі да ўлады. Былыя кіруючыя камуністычныя і рабочыя партыі, чыя ідэалогія была пануючай на працягу ўсіх пасляваенных гадоў, ператварыліся ў апазіцыю і перажылі нялёгкія часы. Пацвердзіліся прагнозы, што рух да плюралістычных структур улады і шматукладнай рыначнай эканомікі будзе суправаджацца адцясненнем на перыферыю грамадскага жыцця левых сіл, камуністычных і рабочых партый.

У цэлым ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне склаліся зусім новыя абставіны. Ідзе працэс стабілізацыі ўрадаў. Больш бачным становіцца іх палітычны курс, які мае на мэце трансфармацыю сацыяльнага ладу ў напрамку буржуазнай дэмакратыі і "вяртанне ў Еўропу". Вынікам гэтага працэсу з'яўляецца адмаўленне ад таго, што было, ад спадчыны "рэальнага" сацыялізму. У асноўным перамены ідуць знешне дэмакратычным шляхам, але дзе-нідзе выяўляюцца рэцыдывы антыкамунізму, узмацняюцца нацыяналістычныя і яўна рэакцыйныя плыні. Разгарнулася перакройка апаратаў улады, адкуль выганяюць камуністаў.

Тэрмін краіны "трэцяга свету", які адносяць звычайна да большасці дзяржаў Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, Акіяніі, мае пэўную долю ўмоўнасці. Працэс развіцця - усеагульны закон дыялектыкі. Аднак названая група дзяржаў характарызуецца некаторымі прынцыповымі асаблівасцямі развіцця, якія абумоўлены іх адсталасцю і залежнасцю. Якія ж агульныя рысы палітычных сістэм у гэтых краінах, якая прырода і межы гэтай агульнасці? Да агульных рыс адносяцца наступныя:

1. Рэвалюцыйнае ўзнікненне новых палітычных сістэм у большасці такіх краін /за выключэннем тых нямногіх, якія ніколі не былі калоніямі/.

2. Спалучэнне, перапляценне ў палітычнай сістэме старога і новага /напрыклад, традыцыйных элементаў, уплыў родаплямённай знаці ў Трапічнай Афрыцы/, інстытутаў, якія адлюстроўваюць палітычны ўплыў капіталізму /напрыклад, канцэпцыя раздзялення ўлады/, і новых элементаў, абумоўленых уплывам палітычнай сістэмы сацыялізму /напрыклад, ідэя дзяржаўнага планавання/.

3. Недастаткова выразна выяўлены монакласавы характар палітычнай улады.

4. Асаблівая роля дзяржавы ў палітычнай сістэме краін. Размова ідзе не аб асаблівай самастойнасці дзяржаўнай улады, а аб тым, што дзяржава як палітычны інстытут іграе дамініруючую ролю ў палітычнай сістэме.

5. Палітычныя сістэмы краін характарызуюцца важным значэннем суб'ектыўнага фактару. Гэта праяўляецца ў павышанай самастойнасці дзяржаўнай улады, у рашаючым уплыве прамежкавых сіл у палітычным жыцці шэрагу краін, асаблівай ролі палітычнага лідэра і звязанай з гэтым так званай "персаналізацыі" ўлады.

6. Характэрнай рысай палітычных сістэм з'яўляецца неразвітасць палітычнай культуры, дэмакратычных інстытутаў, вялікі ўплыў звычаеў, традыцыйных норм паводзін на палітычнае жыццё. У краінах Трапічнай Афрыкі гэта знаходзіць сваё выражэнне перш за ўсё ва ўплыве трайбалізму. Правадыры плямён, хаця і пазбаўлены зараз у большасці краін адміністрацыйных паўнамоцтваў, аказваюць значны ўплыў на ход выбараў.

Аналіз тэндэнцый развіцця палітычных сістэм у капіталістычных, сацыялістычных і краінах трэцяга свету паказвае неабходнасць далейшай перабудовы міравых палітычных адносін на

прынцыпах новага палітычнага мыслення. Палітычная сістэма грамадства ўяўляе сабой адну з падсістэм побач з эканамічнай і духоўнай, якія выдзяляюцца па прыкмеце сферы жыццядзейнасці сацыяльных груп. Раскрываючы функцыі і тыпы палітычнай сістэмы грамадства, палітычная навука дае магчымасць не толькі зразумець і асэнсаваць сутнасць і змест палітычнай сістэмы, але і прадбачыць магчымыя павароты. Яна дае ў рукі практыкам інструмент, які дазваляе накіраваць палітычны працэс у патрэбнае рэчышча.

## ПАЛІТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ І ПАЛІТЫЧНАЯ ЎЛАДА

Паняцце "ўлада" адносіцца да ліку асноватворных паняццяў палітычнай тэорыі. Яно дае ключ да разумення ўсяго палітычнага жыцця грамадства. Вось чаму ў паліталогіі існуе шмат трактовак яго. Улада - гэта адносіны па крайняй меры двух суб'ектаў. Таму вывучэнне палітычнай улады трэба пачынаць з разгляду палітычных адносін і на гэтай аснове вызначаць яе сутнасць, структуру, функцыі і механізмы ажыццяўлення. Адпаведна гэтаму мы прапануем наступны план выкладання:

1. Суб'екты палітыкі і палітычныя адносіны.
2. Палітычная ўлада: паходжанне, сутнасць, структура.
3. Сацыяльныя носьбіты палітычнай улады.

Палітычныя адносіны складваюцца паміж асобнымі суб'ектамі палітыкі, г.зн. тымі, хто непасрэдна ўдзельнічае у палітычным жыцці грамадства і, у той ці іншай ступені, уплывае на яе. Зразумела, што суб'екты палітыкі надзвычай разнастайныя: ад асобных індывідаў да буйных сацыяльных супольнасцей. Пагэтаму мы пералічым самыя асноўныя, падзяляючы іх на дзве групы. Да першай групы суб'ектаў палітыкі адносяцца асноўныя сацыяльныя супольнасці. Гэта: народ, клас, сацыяльная група, нацыя, індывіды, з якіх і складаюцца ўсе сацыяльныя супольнасці.

Найбольш буйным суб'ектам палітыкі з'яўляецца народ. Як правіла, гэтым паняццем называем усё насельніцтва той або іншай краіны. Гэта адзінае сацыяльнае цэлае, якое мае агульны гістарычны лёс. Мы абмяжуемся самым агульным азначэннем паняцця "народ", што не выключае іншых трактовак гэтай складанай катэгорыі. У склад народа ўваходзяць розныя класы і сацыяльныя